ЗАЦВЕРДЖАНА
Рашэнне Мастоўскага раённага
выканаўчага камітэта
________№_________

# С Т А Т У Т
Дзяржаўнай установы адукацыі
“Мікелеўшчынскі вучэбна – педагагічны комплекс
дзіцячы сад – сярэдняя школа”
(у новай рэдакцыі)

# У С Т А В
Государственного учреждения образования
“Микелевщинский учебно – педагогический комплекс
детский сад – средняя школа»
(в новой редакции)

Мікелеўшчына
2014

# РАЗДЗЕЛ 1
# АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

1.1. Сапраўдны Статут з'яўляецца новай рэдакцыяй Статута Дзяржаўнай установы адукацыі "Мікелеўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа".

1.2. Дзяржаўная ўстанова адукацыі "Мікелеўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа" (далей – Установа) створана на аснове дзяржаўнай формы ўласнасці, з'яўляецца некамерцыйнай арганізацыяй, якая фінансуецца з мясцовага бюджэту.

1.3. Установа адносіцца да навучальнай. Тып - установа агульнай сярэдняй адукацыі, від – навучальна-педагагічны комплекс.

1.4. Заснавальнікам Установы выступае Мастоўскі раённы выканаўчы камітэт (далей – Заснавальнік). Органам дзяржаўнага кіравання Установы з'яўляецца аддзел адукацыі, спорту і турызму Мастоўскага раённага выканаўчага камітэта (далей – Упаўнаважаны орган).

1.5. Прадметам дзейнасці Установы з'яўляецца адукацыйная дзейнасць і іншая дзейнасць Установы, якая здзяйсняецца ў сферы адукацыі па рэалізацыі адукацыйных праграм дашкольнай, пачатковай, базавай, сярэдняй адукацыі, праграм спецыяльнай адукацыі, праграмы выхавання дзяцей, якія патрабуюць аздараўлення, а таксама праграмы выхавання і абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы.

1.6. Установа з'яўляецца юрыдычнай асобай ў арганізацыйна-прававой форме ўстановы.

1.7. Установа мае разліковы рахунак ва ўстанове банка для фінансавання сваёй дзейнасці з мясцовага бюджэту. Акрамя бюджэтнага рахунку школа можа мець ва ўстановах банка спецыяльны, дабрачынны і іншыя рахункі.

1.8. Установа мае круглую пячатку з выявай герба Рэспублікі Беларусь і сваёй назвай, вуглавы штамп, шыльды ўсталяванага ўзору.

1.9. Установа мае структурныя падраздзяленні: бібліятэка, вучэбна-вопытны ўчастак, пункт карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, - якія функцыянуюць на падставе палажэння аб адпаведных структурных падраздзяленнях.

1.10. У сваёй дзейнасці Установа кіруецца Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь, Палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, Палажэннем аб установе дашкольнай адукацыі і іншымі актамі заканадаўства і сапраўдным Статутам.

1.11. Установа ў пытаннях выхавання ў пазаўрочны час можа ўзаемадзейнічаць з зарэгістраванымі рэлігійнымі арганізацыямі з улікам іх уплыву на фарміраванне маральных, агульначалавечых каштоўнасцей навучэнцаў на падставе пісьмовых заяў законных прадстаўнікоў непаўналетніх.

1.12. Ва Установе і на яе тэрыторыі забаронена курэнне і распіццё спіртных напояў.

1.13. Установа праводзіць адміністрацыйныя працэдуры ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

1.14. Месца знаходжання Установы: 231611, Рэспубліка Беларусь, Гродзенская вобласць, аграгарадок Мікелеўшчына, в. Школьная, д. №16.

1.15. Назва школы:

Поўная:

на беларускай мове – Дзяржаўная ўстанова адукацыі “Мікелеўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс дзіцячы сад – сярэдняя школа”;

на рускай мове – Государственное учреждение образования «Микелевщинский учебно – педагогический комплекс детский сад – средняя школа».

Скарочаная:

на беларускай мове – Мікелеўшчынскі дзіцячы сад – сярэдняя школа;

на рускай мове – Микелевщинский детский сад – средняя школа.

## РАЗДЗЕЛ 2
## ПРАДМЕТ, МЭТЫ, ЗАДАЧЫ ДЗЕЙНАСЦІ УСТАНОВЫ

2.1. Прадметам Установы з’яўляецца адукацыйная дзейнасць, якая ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

2.2. Асноўнай мэтай Установы з'яўляецца фарміраванне ведаў, уменняў, навыкаў і інтэлектуальнае, маральнае, творчае і фізічнае развіццё асобы навучэнца.

2.3. Для выканання пастаўленых мэт Установа адукацыі вырашае наступныя задачы:

- забеспячэнне атрымання навучэнцамі агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама неабходных для выбару ў будучым прафесіі, першасных ведаў і навыкаў;
- авалоданне навучэнцамі асновамі навук, дзяржаўнымі мовамі Рэспублікі Беларусь, навыкамі разумовай і фізічнай працы;
- падрыхтоўка вучняў да паступлення ва ўстановы, якія забяспечваюць атрыманне прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі;
- падрыхтоўка навучэнца да паўнавартаснага жыцця ў грамадстве;
- арганізацыя метадычнай і даследчай працы па ўдасканаленні якасці навучання, педагагічнага майстэрства педагогаў, навуковай арганізацыі адукацыйнага працэсу з выкарыстаннем сучасных тэхнічных сродкаў;
- ажыццяўленне эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці ў сферы адукацыі;
- задавальненне запытаў сям’і ў навучанні, выхаванні і развіцці навучэнцаў у інтарэсах бацькоў і дзяцей;
- фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму і нацыянальнай самасвядомасці на аснове дзяржаўнай ідэалогіі;

- развіццё і ўмацаванне фізічнага і псіхічнага здароўя дзяцей, выхаванне адказных адносін да асабістага здароўя і здароўя іншых грамадзян;
- сацыяльна-педагагічная падтрымка дзяцей;
- развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы адукацыі.

2.4. Установа можа ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці:
- дашкольная адукацыя, 80101;
- агульная сярэдняя адукацыя I ступені, 80102;
- агульная сярэдняя адукацыя II і III ступені, 80210;
- дзейнасць па забеспячэнню бяспекі юрыдычных і фізічных асоб, 17001400.

Таксама Установа можа ажыццяўляць наступныя віды дзейнасці ў адпаведнасці з Агульнадзяржаўным класіфікатарам Рэспублікі Беларусь ОКРБ 005-2006 "Віды эканамічнай дзейнасці", зацверджанага пастановай Дзяржстандарту Рэспублікі Беларусь ад 28 снежня 2006 г. № 65:
- здача ўнаймы ўласнай нерухомай маёмасці, 70200 ;
- іншыя віды дзейнасці, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

## РАЗДЗЕЛ 3
## ПАРАДАК АРГАНІЗАЦЫІ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

3.1. Установа з'яўляецца ўстановай агульнай сярэдняй адукацыі, у якой ажыццяўляецца навучанне і выхаванне на ўзроўні дашкольнай і агульнай сярэдняй адукацыі, рэалізуецца праграма выхавання і абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі, адукацыйная праграма дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, праграма выхавання дзяцей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні.

3.2. Ва Установе вочная форма атрымання адукацыі.

3.3. Асноўная мова навучання і выхавання - беларуская.

Абавязковая для вывучэння замежная мова - нямецкая. Па рашэнні Заснавальніка, з улікам магчымасцей Установы, могуць адкрывацца класы з вывучэннем іншай замежнай мовы.

Вывучэнне беларускай, рускай і адной з замежных моў ва Установе з'яўляецца абавязковым, за выключэннем асобных катэгорый дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, для якіх вывучэнне мовы вызначаецца нарматыўнымі прававымі актамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Ад вывучэння беларускай мовы могуць быць вызвалены замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, якія пражываюць ці часова знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь. Парадак вывучэння беларускай мовы замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія пражываюць ці часова знаходзяцца ў Рэспубліцы Беларусь, вызначаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3.4. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі ажыццяўляецца ў рознаўзроставых групах.

3.5. Агульная сярэдняя адукацыя ва Установе складаецца з:

- I ступень – пачатковая адукацыя (I–IV класы), тэрмін атрымання чатыры гады, для асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця – ад чатырох да пяці гадоў;

- II ступень – базавая адукацыя (V–IX класы), тэрмін атрымання пяць гадоў;

- III ступень – сярэдняя адукацыя (X–XI класы), тэрмін атрымання два гады.

I і II ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць агульную базавую адукацыю, тэрмін атрымання дзевяць гадоў.

I, II і III ступені агульнай сярэдняй адукацыі складаюць агульную сярэднюю адукацыю, тэрмін атрымання адзінаццаць гадоў.

3.6. На I ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма пачатковай адукацыі.

Пачатковая адукацыя дае права на працяг навучання на II ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

3.7. На II ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма базавай адукацыі.

Агульная базавая адукацыя дае права на працяг навучання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

Засваенне зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі з'яўляецца абавязковым.

3.8. На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі рэалізуецца адукацыйная праграма сярэдняй адукацыі.

Агульная сярэдняя адукацыя дае права на працяг навучання на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай, вышэйшай адукацыі.

3.9. Арганізацыя адукацыйнага працэсу ва Установе ажыццяўляецца на аснове адукацыйных стандартаў у адпаведнасці з навучальна-праграмнай дакументацыяй (навучальнымі планамі і навучальнымі праграмамі), распрацоўка, узгадненне і зацвярджэнне якой устанаўліваецца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

3.10. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляецца ў класах ці індывідуальна на падставе рашэння дырэктара Установы ў адпаведнасці з індывідуальным навучальным планам і ў выпадку і парадку, вызначаным палажэннем аб ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі. Індывідуальныя вучэбныя планы ўзгадняюцца з Саветам Установы і зацвярджаюцца педагагічным саветам Установы. Структура, змест вучэбных планаў і вучэбных праграм ствараюцца з улікам магчымасцей, запытаў і інтарэсаў вучняў, забяспечваюць пераемнасць зместу адукацыі на ўсіх ступенях агульнай сярэдняй адукацыі.

3.11. Ва Установе пры неабходнасці могуць функцыянаваць класы (групы) інтэграванага навучання і выхавання, у якіх рэалізуюцца адукацыйныя праграмы дашкольнай адукацыі, агульнай сярэдняй адукацыі і адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі.

3.12. Адукацыйны працэс арганізуецца па навучальных гадах. Навучальны год падзяляецца на чвэрці.

Працягласць навучальнага года - з 1 верасня па 1 чэрвеня. Калі дадзеныя даты прыходзяцца на нерабочы дзень, то пачатак (заканчэнне) навучальнага года пераносіцца на наступны (папярэдні) рабочы дзень.

3.13. На працягу навучальнага года для навучэнцаў устанаўліваюцца канікулы: восеньскія; зімовыя; вясновыя; летнія.

Для навучэнцаў 1-2 класаў у трэцяй чвэрці ў лютым (трэці тыдзень месяца) праводзяцца дадатковыя канікулы працягласцю ў адзін тыдзень.

Агульная працягласць канікул на працягу навучальнага года складае не меней трыццаці каляндарных дзён, для навучэнцаў I і II класаў – не меней трыццаці сямі каляндарных дзён.

Працягласць летніх канікул складае не меней 12 каляндарных тыдняў, а для навучэнцаў IX класаў – не меней 10 каляндарных тыдняў.

3.14. Ва ўстанове пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі устанаўліваюцца канікулы, у перыяд якіх заняткі з выхаванцамі не праводзяцца. У перыяд канікул праводзіцца толькі фізкультурна-аздараўленчая і мастацка-эстэтычная работа з выхаванцамі.

Агульная працягласць канікул складае сто дзесяць дзён: летнія - дзевяноста каляндарных дзён, зімовыя - дзесяць каляндарных дзён, вясеннія – дзесяць каляндарных дзён.

3.15. Адукацыйны працэс пры навучанні і выхаванні на I, II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі арганізуецца ў рэжыме шасцідзённага школьнага тыдня, які ўключае пяцідзённы вучэбны тыдзень і адзін дзень тыдня для правядзення з навучэнцамі спартыўна-масавых, фізкультурна-аздараўленчых, іншых выхаваўчых мерапрыемстваў.

3.16. Адукацыйны працэс пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дашкольнай адукацыі арганізуецца ў рэжыме пяцідзённага тыдня і можа складаць ад 2 да 10,5 гадзін.

3.17. Вывучэнне вучэбных прадметаў ва Установе ажыццяўляецца на базавым узроўні.

Навучэнцы з улікам меркавання іх законных прадстаўнікоў, зыходзячы са схільнасцяў, жаданняў і стану здароўя, могуць вывучаць асобныя вучэбныя прадметы на павышаным узроўні на факультатыўных занятках у межах устаноўленага тыпавым вучэбным планам колькасці навучальных гадзін.

3.18. Асноўнай формай арганізацыі адукацыйнага працэсу ва Установе з'яўляецца вучэбны занятак: урок, назіранне, экскурсія, пазакласны і іншыя заняткі. Вучэбныя заняткі могуць праводзіцца па зменах. Дадаткова праводзяцца факультатыўныя, стымулюючыя, падтрымліваючыя заняткі, навучальна-палявыя зборы, грамадска-карысная праца.

3.19. Асноўнымі формамі арганізацыі адукацыйнага працэсу ва Установе пры рэалізацыі праграмы дашкольнай адукацыі з’яўляюцца гульня, занятак.

3.20. Працягласць урока і занятка вызначаецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі санітарных норм і правіл.

Штодзённая колькасць вучэбных заняткаў, іх зменнасць вызначаецца раскладам, які зацвярджаецца дырэктарам Установы і ўзгадняецца старшынёй прафкама ў адпаведнасці з санітарнымі нормамі і правіламі.

3.21. Факультатыўныя заняткі могуць быць прыродазнаўча-матэматычнай, гуманітарнай, грамадазнаўчай, экалагічнай, ваенна-патрыятычнай, музычнай, харэаграфічнай, мастацкай, тэатральнай, спартыўнай і іншай накіраванасці.

3.22. Расклад факультатыўных заняткаў складаецца ў адпаведнасці з санітарнымі нормамі і правіламі і зацвярджаецца дырэктарам Установы.

Працягласць факультатыўных заняткаў вызначаецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі санітарных норм і правіл.

3.23. Напаўняльнасць I-IV класаў і класаў інтэграванага навучання і выхавання не павінна перавышаць 20 навучэнцаў, V–XI класаў – 25 навучэнцаў.

Класы могуць падзяляцца на групы ў выпадках і парадку, вызначаным палажэннем аб ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі.

3.24. Напаўняльнасць рознаўзроставых груп і груп інтэграванага навучання і выхавання не павінна перавышаць 12 выхаванцаў.

3.25. Для навучэнцаў, якія па медыцынскіх заключэннях часова ці ўвесь час не могуць наведваць Установу, ствараюцца ўмовы для атрымання агульнай сярэдняй адукацыі дома, у адпаведнасці з рашэннем Заснавальніка на падставе заявы навучэнца (законнага прадстаўніка непаўналетняга навучэнца) і заключэння медыка-кансультацыйнай камісіі.

Пералік медыцынскіх паказчыкаў для атрымання адукацыі дома вызначаецца Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь.

3.26. Для аказання дапамогі сям'і ў навучанні і выхаванні навучэнцаў, стварэнні ўмоў для развіцця іх творчых здольнасцяў ва Установе могуць адкрывацца групы падоўжанага дня для навучэнцаў I–IX класаў, якія функцыянуюць на падставе палажэння, зацверджанага Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3.27. Атрыманне адукацыі суправаджаецца бягучай, прамежкавай і выніковай атэстацыяй, парадак правядзення якой вызначаецца Правіламі правядзення атэстацыі навучэнцаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі. Пры правядзенні прамежкавай і выніковай атэстацыі ажыццяўляецца ацэнка паводзін навучэнцаў: «прыкладныя», «здавальняючыя», «нездавальняючыя». Крытэрыі ацэнкі паводзін навучэнцаў вызначаюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3.28. Выніковая атэстацыя праводзіцца па завяршэнні навучальнага года, навучанні і выхаванні на II і III ступенях агульнай сярэдняй адукацыі і выражаецца ў выстаўленні выніковых адзнак па навучальных прадметах, па якіх праводзяцца выпускныя экзамены, з улікам гадавой і экзаменацыйнай адзнак. Пералік вучэбных прадметаў, па якіх праводзяцца выпускныя экзамены, формы правядзення выпускных экзаменаў штогод да пачатку навучальнага года ўстанаўліваюцца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3.29. Карэкцыйна-педагагічная дапамога для асоб, якія засвойваюць змест адукацыйных праграм агульнай сярэдняй адукацыі і адчуваюць пастаянныя ці

часовыя цяжкасці ў іх засваенні, аказваецца ў пункце карэкцыйна-педагагічнай дапамогі, палажэнне аб якім зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3.30. Сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі ажыццяўляецца сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службай Установы, палажэнне аб якой зацвярджаецца Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

3.31. Бібліятэка з′яўляецца абавязковым структурным падраздзяленнем Установы, якая прызначана садзейнічаць працэсу навучання і выхавання навучэнцаў, павышэнню кваліфікацыі работнікаў Установы. Задачы, змест і арганізацыя работы бібліятэкі вызначаюцца Палажэннем аб  бібліятэцы, якое зацверджана Міністэрствам адукацыі і навукі Рэспублікі Беларусь.

3.32. Парадак уліку дзяцей, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, вызначаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

3.33. Сумесна з Упраўленнем па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мастоўскага райвыканкама Установа ажыццяўляе дзейнасць па праектах часовай занятасці моладзі, якая навучаецца.

3.34. Прыём асоб ва Установу ажыццяўляецца ў адпаведнасці з кантрольнымі лічбамі прыёму, з улікам патрабаванняў санітарных нормаў і правіл.

3.35. Кантрольныя лічбы прыёму ўстанаўліваюцца Упаўнаважаным органам штогод.

3.36. Прыём асоб ва Установу ажыццяўляецца на падставе яго заявы пры прад'яўленні ім пасведчання аб нараджэнні ці дакумента, які пацвярджае асобу, і медыцынскай даведкі аб стане здароўя (медыцынскай карты). Ад імя непаўналетняга заява можа быць пададзена яго законным прадстаўніком.

3.37. Першачарговым правам залічэння ва Установу карыстаюцца асобы, якія пражываюць на тэрыторыі, замацаванай за Установай рашэннем Заснавальніка.

3.38. Дзеці, якія не пражываюць на тэрыторыі мікраараёна, замацаванага за Установай, могуць быць залічаны пры наяўнасці вольных месцаў.

3.39.  У І клас Установы прымаюцца асобы, якім на 1 верасня адпаведнага навучальнага года спаўняецца шэсць і больш гадоў. Па жаданні аднаго з законных прадстаўнікоў дзіцяці дапускаецца прыём у І клас асобы, якой шэсць гадоў споўніцца ў перыяд з 1 па 30 верасня адпаведнага года.

У першую чаргу ў першы клас прымаюцца асобы, якія пражываюць на тэрыторыі мікраараёна, замацаванага за Установай, рашэннем Заснавальніка. Асобы, якія не пражываюць на тэрыторыі мікраараёна, могуць быць залічаны пры наяўнасці вольных месцаў у парадку чарговасці падачы заяў іх законнымі прадстаўнікамі.

Рашэнне аб залічэнні ва Установу асоб для навучання ў І класе афармляецца загадам дырэктара не пазней 31 жніўня і даводзіцца да законнага прадстаўніка.

3.40. Прыём асоб у X клас Установы ажыццяўляецца на падставе іх заявы ці заявы законных прадстаўнікоў і прадастаўленні пасведчання аб агульнай базавай адукацыі, медыцынскай даведкі аб стане здароўя.

3.41. Перавод асобы па ініцыятыве законнага прадстаўніка ў іншую ўстанову адукацыі для працягу навучання і выхавання ў адпаведным класе ажыццяўляецца на падставе заявы законнага прадстаўніка і прадастаўленні асабовай справы навучэнца і медыцынскай даведкі аб стане здароўя пры ўмове згоды дырэктара ўстановы, у якую ён пераходзіць.

Рашэнне аб залічэнні асоб у парадку пераводу афармляецца загадам дырэктара Установы на працягу трох дзён з дня падачы заявы і даводзіцца да іх законных прадстаўнікоў.

3.42. Адлічэнне навучэнцаў з Установы ажыццяўляецца на падставе загада дырэктара ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, палажэння аб ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі.

3.43.У мэтах забеспячэння атрымання навучэнцамі абавязковай агульнай базавай адукацыі Установа ажыццяўляе ўлік дзяцей, якія падлягаюць навучанню на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, якія пражываюць у мікрараёне, тэрытарыяльна замацаваным за ўстановай адукацыі, у парадку, вызначаным Урадам Рэспублікі Беларусь.

3.44. Арганізацыя харчавання ва Установе можа ажыццяўляцца юрыдычнымі асобамі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія спецыялізуюцца на аказанні паслуг грамадскага харчавання ў адпаведнасці з патрабаваннямі санітарных нормаў і правіл, па ўстаноўленых нормах харчавання і грашовых нормах выдаткаў на харчаванне для адпаведных катэгорый навучэнцаў. Нормы харчавання, грашовыя нормы выдаткаў на харчаванне зацвярджаюцца Урадам Рэспублікі Беларусь ці ўпаўнаважаным ім органам.

3.45. Навучэнцы забяспечваюцца харчаваннем за кошт сродкаў іх законных прадстаўнікоў, сродкаў мясцовага бюджэту.

3.46. Палажэнне аб забеспячэнні харчавання навучэнцаў за кошт сродкаў мясцовага бюджэту зацвярджаецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

3.47. Памер і парадак аплаты за карыстанне падручнікамі і (ці) навучальнымі дапаможнікамі, парадак перадачы іх у бясплатнае карыстанне ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь.

3.48. Аказанне медыцынскай дапамогі навучэнцам ва Установе ажыццяўляецца дзяржаўнымі арганізацыямі аховы здароўя па месцы знаходжання.

3.49. У мэтах арганізацыі аздараўлення навучэнцаў у канікулярны перыяд ва Установе могуць функцыянаваць аздараўленчыя лагеры дзённага знаходжання рознай накіраванасці.

## РАЗДЗЕЛ 4
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ЎСТАНОВЫ

4.1. Установа ў адпаведнасці з заканадаўствам мае права:

- ажыццяўляць адукацыйную дзейнасць;
- фарміраваць структуру і штатны расклад;
- ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць прыбыткі;
- ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі.

Іншыя правы Установы ўстанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства.

4.2. Установа абавязана забяспечыць:

- якасць адукацыі;
- распрацоўку і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку структурных элементаў навукова-метадычнага забеспячэння агульнай сярэдняй адукацыі, яго ўдасканаленне;
- падбор, прыём на працу і расстаноўку кадраў, павышэнне іх кваліфікацыі;
- матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу ў адпаведнасці з устаноўленымі санітарнымі нормамі і правіламі;
- стварэнне бяспечных умоў пры арганізацыі адукацыйнага працэсу;
- распрацоўку і прыняцце правіл унутранага распарадку для навучэнцаў, для педагагічных і іншых работнікаў школы;
- меры сацыяльнай абароны навучэнцаў;
- стварэнне неабходных умоў для арганізацыі харчавання і медыцынскай дапамогі навучэнцаў;
- азнаямленне асоб (законных прадстаўнікоў непаўналетніх) пры залічэнні ва Установу з пасведчаннем аб дзяржаўнай рэгістрацыі, Статутам, сертыфікатам аб дзяржаўнай акрэдытацыі, а па іх патрабаванні – і з навучальна-праграмнай дакументацыяй;
- патранат асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця на працягу двух гадоў пасля атрымання адукацыі ў адпаведнасці з палажэннем аб патранаце асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь;
- садзейнічанне ўпаўнаважаным дзяржаўным органам у правядзенні кантролю за забеспячэннем якасці адукацыі.

Іншыя абавязкі ўстанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства.

## РАЗДЗЕЛ 5
## ПРАВЫ І АБАВЯЗКІ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

5.1. Удзельнікамі адукацыйнага працэсу ва Установе з'яўляюцца навучэнцы, законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў, педагагічныя работнікі.

5.2. Навучэнцамі з'яўляюцца асобы, прынятыя ва Установу для засваення зместу адукацыйнай праграмы.

5.3.Навучэнцы ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі актамі заканадаўства:

5.3.1. маюць права на:

- атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з адукацыйнай праграмай;
- перайсці ў іншую ўстанову адукацыі;
- навучанне па індывідуальных навучальных планах ў межах зместу адукацыйнай праграмы;
- стварэнне спецыяльных умоў для атрымання адукацыі з улікам асаблівасцяў іх псіхафізічнага развіцця;
- ахову жыцця і здароўя падчас адукацыйнага працэсу;
- канікулы;
- карыстанне падручнікамі і навучальнымі дапаможнікамі;
- атрыманне платных паслуг;
- атрыманне харчавання ў адпаведнасці з заканадаўствам;
- атрыманне сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай дапамогі з боку спецыялістаў сацыяльна-педагагічнай і псіхалагічнай службы Установы;
- заахвочванне за поспехі ў навучальнай, спартыўна-масавай, грамадскай дзейнасці, а таксама ў адукацыйных мерапрыемствах;
- удзел у кіраванні Установай;
- удзел у алімпіядах, конкурсах, турнірах, фэстах, канферэнцыях і іншых адукацыйных мерапрыемствах;
- удзел у маладзёжных і іншых грамадскіх аб'яднаннях, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству;

5.3.2.абавязаны:
- добрасумленна і адказна ставіцца да засваення зместу адукацыйных праграм, праграм выхавання;
- клапаціцца пра сваё здароўе, імкнуцца да маральнага, духоўнага і фізічнага развіцця і самаўдасканалення;
- выконваць дадзены Статут і кіравацца ўнутраным распарадкам для навучэнцаў;
- паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;
- асцярожна ставіцца да маёмасці Установы;
- захоўваць класічны дзелавы стыль у адзенні.

5.4. Выпадкі дысцыплінарнай адказнасці навучэнцаў:
- невыкананне без уважлівых прычын законнага патрабавання педагагічнага ці іншага работніка Установы;
- распаўсюджванне інфармацыі, якая наносіць шкоду здароўю навучэнцаў;
- насіць ва Установу і мець пры сабе небяспечныя прадметы, асабліва зброю, патроны, петарды і г.д.;
- пачынаць, правацыраваць бойкі ва Установе, на яе тэрыторыі і пры правядзенні пазашкольных мерапрыемстваў;
- спазняцца ці адсутнічаць на занятках без уважлівай прычыны;
- ужываць алкагольныя напоі, наркатычныя, таксічныя, псіхатропныя і іншыя адурманьваючыя рэчывы, мець іх, знаходзіцца пад іх уздзеяннем ва Установе і на праводзімых Установай мерапрыемствах;
- курыць у памяшканнях і на тэрыторыі Установы;
- удзельнічаць у рызыкоўных гульнях, як на ўроках, так і на перапынках;

- дапускаць крадзёж, вандалізм, наносіць наўмысна шкоду школьнай маёмасці, уласнасці навучэнцаў і работнікаў Установы;
- сістэматычна не выконваць хатнія заданні ці выконваць іх недобрасумленна;
- насіць у памяшканні Установы галаўныя ўборы;
- карыстацца мабільнымі тэлефонамі падчас адукацыйнага працэсу;
- парушаць класічны дзелавы стыль у адзенні;
- выкарыстоўваць ненарматыўную лексіку.

5.5. Да дысцыплінарнай адказнасці прыцягваюцца навучэнцы, якія дасягнулі на момант здзяйснення дысцыплінарнага парушэння ўзросту чатырнаццаці гадоў, а навучэнец з ліку асоб з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця - сямнаццаці гадоў.

Да навучэнца, які здзейсніў дысцыплінарнае парушэнне і не дасягнуў на момант яго здзяйснення ўзросту, з якога настае дысцыплінарная адказнасць, могуць прымяняцца меры педагагічнага ўздзеяння (гутарка, абмеркаванне на педагагічным савеце і іншыя меры педагагічнага ўздзеяння), якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

За здзяйсненне дысцыплінарнага парушэння да навучэнца могуць прымяняцца наступныя меры дысцыплінарнага спагнання:
-заўвага;
-вымова;
-адлічэнне.

Адлічэнне як мера дысцыплінарнай адказнасці можа быць прыменена за сістэматычнае (паўторнае на працягу навучальнага года) невыкананне ці неналежнае выкананне абавязкаў навучэнца, калі да яго раней прымяняліся меры дысцыплінарнага спагнання.

Адлічэнне як мера дысцыплінарнага спагнання не прымяняецца да навучэнца, які не завяршыў засваенне зместу адукацыйнай праграмы базавай адукацыі; навучэнца, які не дасягнуў узросту шаснаццаці гадоў.

Прымяненне ў якасці меры дысцыплінарнага спагнання адлічэння да непаўналетняга навучэнца дапускаецца толькі пасля апавяшчэння камісіі па справах непаўналетніх.

Права выбару меры дысцыплінарнага спагнання належыць дырэктару Установы. Пры выбары меры дысцыплінарнага спагнання павінны ўлічвацца цяжкасць дысцыплінарнага парушэння, прычыны і абставіны, пры якіх яно было здзейснена, папярэднія паводзіны навучэнца.

Навучэнец, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, лічыцца невінаватым, пакуль яго віна не будзе даказана і пацверджана загадам дырэктара Установы аб прымяненні меры дысцыплінарнага спагнання.

Навучэнец, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, не абавязаны даказваць сваю невінаватасць. Сумненні ў вінаватасці навучэнца, які прыцягваецца да дысцыплінарнай адказнасці, тлумачацца ў яго карысць.

Прычынамі для прыцягнення навучэнца да дысцыплінарнай адказнасці могуць служыць паведамленні мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў,

праваахоўных органаў, іншых дзяржаўных органаў і арганізацый, дакладныя запіскі педагагічных і іншых работнікаў Установы.

За кожнае дысцыплінарнае парушэнне можа быць прыменена толькі адна мера дысцыплінарнага спагнання.

Дысцыплінарныя спагнанні да навучэнца прымяняюцца ў адпаведнасці з Кодэксам аб адукацыі Рэспублікі Беларусь.

5.6. Законнымі прадстаўнікамі непаўналетніх навучэнцаў з'яўляюцца іх бацькі, усынавіцелі, апекуны.

Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў маюць права абараняць законныя інтарэсы непаўналетніх навучэнцаў у грамадскіх адносінах у сферы адукацыі без спецыяльных паўнамоцтваў.

Законныя прадстаўнікі непаўналетніх навучэнцаў у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі і іншымі актамі заканадаўства:

5.6.1. маюць права на:

- удзел у кіраванні Установай;

- абарону правоў і законных інтарэсаў навучэнцаў;

- азнаямленне з ходам і зместам адукацыйнага працэсу, вынікамі вучэбнай дзейнасці навучэнцаў;

- атрыманне інфармацыі аб усіх відах абследаванняў (медыцынскіх, псіхалагічных, педагагічных) навучэнцаў.

5.6.2. абавязаны:

- забяспечваць умовы для атрымання адукацыі і развіцця навучэнцаў;

- паважаць гонар і годнасць іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

- выконваць патрабаванні дадзенага Статута, кіравацца унутраным распарадкам для навучэнцаў і законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў.

5.7. Педагагічнымі работнікамі прызнаюцца асобы, якія ажыццяўляюць педагагічную дзейнасць на падставе працоўнага дагавора.

Асноўныя патрабаванні, прад'яўленыя да педагагічных работнікаў, вызначаюцца кваліфікацыйнымі характарыстыкамі, зацверджанымі ў парадку, устаноўленым заканадаўствам.

Педагагічную дзейнасць не могуць ажыццяўляць асобы, пазбаўленыя права займацца ёю, якія маюць асуджанасць, прызнаныя недзеяздольнымі ці абмежавана дзеяздольнымі, якія не мелі права займацца педагагічнай дзейнасцю ў выпадках, прадугледжаных заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

Педагагічныя работнікі ў адпаведнасці з заканадаўствам

5.7.1. маюць права на:

- абарону прафесійнага гонару і годнасці;

- забеспячэнне ўмоў для ажыццяўлення прафесійнай дзейнасці;

- творчую ініцыятыву;

- выбар педагагічна абгрунтаваных формаў і метадаў навучання і выхавання, вучэбных выданняў і сродкаў навучання;

- доступ да навучальна-праграмнай, навучальна-метадычнай дакументацыі, інфармацыйна-аналітычных матэрыялаў;

- удзел у навуковай, навукова-тэхнічнай, эксперыментальнай, інавацыйнай, міжнароднай дзейнасці Установы;

- удзел у кіраванні Установай;

- павышэнне кваліфікацыі;

- маральнае і матэрыяльнае заахвочванне за поспехі ў педагагічнай дзейнасці;

- аб'яднанне ў прафесійныя аб’яднанні, іншыя грамадскія аб'яднанні, дзейнасць якіх не супярэчыць заканадаўству.

Іншыя правы педагагічных работнікаў устанаўліваюцца заканадаўствам, лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы, іх працоўнымі дагаворамі.

5.7.2. абавязаны:

- ажыццяўляць сваю дзейнасць на прафесійным узроўні, які забяспечвае рэалізацыю адукацыйных праграм, праграм выхавання;

- выконваць прававыя, маральныя і этычныя нормы;

- паважаць гонар і годнасць навучэнцаў іншых удзельнікаў адукацыйнага працэсу;

- павышаць свой прафесійны ўзровень, праходзіць атэстацыю;

- весці здаровы лад жыцця і прапагандаваць яго сярод навучэнцаў;

- выконваць спецыяльныя ўмовы, неабходныя для атрымання адукацыі асобам з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця;

- праходзіць папярэдні медыцынскі агляд пры паступленні на працу і перыядычныя медыцынскія агляды ў парадку, устаноўленым Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь;

- весці выхаваўча-прафілактычную працу па папярэджанні супрацьпраўных паводзін сярод навучэнцаў;

- своечасова інфармаваць законных прадстаўнікоў навучэнца пра парушэнне ім Статута і ўнутранага распарадку Установы;

- прапагандаваць педагагічныя веды, весці працу з законнымі прадстаўнікамі навучэнцаў;

- выконваць загады і распараджэнні дырэктара Установы.

5.8. Да іншых работнікаў Установы адносяцца асобы, якія выконваюць адміністрацыйна-гаспадарчыя, інжынерна-тэхнічныя, вытворчыя і іншыя дапаможныя функцыі.

Правы і абавязкі іншых работнікаў Установы ўстанаўліваюцца заканадаўствам, лакальнымі нарматыўнымі прававымі актамі Установы, іх працоўнымі дагаворамі.

5.9. Замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства, часова прыбыўшыя ці часова пражываючыя ў Рэспубліцы Беларусь, маюць права на атрыманне адукацыі ў адпаведнасці з міжнароднымі дагаворамі Рэспублікі Беларусь.

## РАЗДЗЕЛ 6
## ПАРАДАК КІРАВАННЯ ДЗЕЙНАСЦЮ УСТАНОВЫ

6.1. Кіраванне Установай ажыццяўляецца ў адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, палажэннем аб установе агульнай сярэдняй адукацыі, палажэннем аб установе дашкольнай адукацыі, іншымі актамі заканадаўства, сапраўдным Статутам і будуецца на спалучэнні прынцыпаў адзінаначалля і самакіравання.

6.2. Непасрэднае кіраўніцтва Установай ажыццяўляе дырэктар, які прызначаецца на пасаду і вызваляецца ад пасады Упаўнаважаным органам па ўзгадненні з Заснавальнікам. Дырэктар Установы ўносіць ва Упаўнаважаны орган прапановы аб назначэнні і вызваленні ад пасады яго намеснікаў.

6.3. Дырэктар Установы:

- дзейнічае ад імя Установы без даверанасці і нясе адказнасць за вынікі яе дзейнасці;

- выдае загады, заключае дагаворы, выдае даверанасці, адкрывае рахункі ў банках у межах сваёй кампетэнцыі;

- ажыццяўляе прыём і звальненне работнікаў, зацвярджае іх службовыя інструкцыі;

- зацвярджае арганізацыйна-штатную структуру Установы па ўзгадненні з Заснавальнікам на падставе тыпавых штатных нарматываў, зацверджаных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, у межах сродкаў, якія выдаюцца на аплату працы;

- адмяняе рашэнні Савета Установы ў выпадках, калі яны супярэчаць дадзенаму Статуту і заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

Іншыя паўнамоцтвы дырэктара Установы ўстанаўліваюцца Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, іншымі актамі заканадаўства.

6.4. Дырэктар Установы ў дзейнасці па кіраванні ўзаемадзейнічае з органамі самакіравання.

6.5. Асноўным органам самакіравання Установы з'яўляецца Савет, які ўзначальваецца дырэктарам.

Склад Савета фарміруецца з навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў, педагагічных і іншых работнікаў Установы.

Савет Установы выбіраецца адкрытым галасаваннем на агульнашкольнай канферэнцыі тэрмінам на тры гады. Персанальны склад Савета зацвярджаецца загадам дырэктара Установы.

Савет ажыццяўляе сваю дзейнасць у адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Палажэннем аб савеце ўстановы адукацыі, зацверджаным Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, іншымі актамі заканадаўства і сапраўдным Статутам.

Рашэнні Савета, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь і зацверджаныя дырэктарам Установы, з'яўляюцца абавязковымі для педагагічных і іншых работнікаў, навучэнцаў і іх законных прадстаўнікоў.

6.6. Да кампетэнцыі Савета адносіцца:

- вызначэнне перспектыўных накірункаў развіцця Установы;

- занясенне прапаноў аб ўдасканаленні структуры Установы, вызначэнне асноўных кірункаў дзейнасці структурных падраздзяленняў;

- прыняцце рашэнняў па пытаннях арганізацыі адукацыйнага працэсу, праграмна-планаванавай дакументацыі выхавання;

- садзейнічанне ў арганізацыі і правядзенні адукацыйных мерапрыемстваў;

- абмеркаванне тэматыкі і вынікаў эксперыментальнай і інавацыйнай дзейнасці;

- разгляд іншых пытанняў, што адносяцца да кампетэнцыі Савета актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

6.7. Ва Установе ствараецца педагагічны савет, могуць стварацца папячыцельскі савет і бацькоўскі камітэт, дзейнасць якіх ажыццяўляецца ў адпаведнасці з палажэннем аб гэтых органах самакіравання.

## РАЗДЗЕЛ 7
## КРЫНІЦЫ І ПАРАДАК ФАРМІРАВАННЯ МАЁМАСЦІ. КАМПЕТЭНЦЫІ ЗАСНАВАЛЬНІКА

7.1. Матэрыяльна-тэхнічная база Установы фарміруецца Заснавальнікам па дзейсных нарматывах, з улікам забеспячэння атрымання агульнай сярэдняй адукацыі.

7.2. Заснавальнік выдзяляе Установе зямельны ўчастак, будынак, збудаванні, абсталяванне і іншую маёмасць у адпаведнасці з санітарнымі нормамі і правіламі, забяспечвае мэбляй, інвентаром, сродкамі навучання, неабходнымі для арганізацыі адукацыйнага працэсу, забяспечвае абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы.

Маёмасць, перададзеная Установе, адносіцца да камунальнай уласнасці і знаходзіцца ў яе аператыўным кіраванні. Установа ў адносінах замацаванай за ёй маёмасці ажыццяўляе ў межах, устаноўленых заканадаўствам, у адпаведнасці з мэтамі сваёй дзейнасці і прызначэннем маёмасці права валодання, карыстання і распараджэння ёю.

7.3. Да кампетэнцыі Заснавальніка Установы таксама адносіцца:

- ажыццяўленне кантролю за адукацыйнай, фінансавай і гаспадарчай дзейнасцю Установы;

- прыняцце рашэння аб змене выгляду, рэарганізацыі і ліквідацыі Установы ў парадку, прадугледжаным Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

- у выпадку спынення дзейнасці Установы прынятце мер па пераводзе навучэнцаў з іх згоды, са згоды законных прадстаўнікоў непаўналетніх навучэнцаў у іншыя ўстановы адукацыі, якія рэалізуюць адпаведныя адукацыйныя праграмы, у парадку, што ўстанаўліваецца Урадам Рэспублікі Беларусь;

- арганізацыя павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі педагагічных і іншых работнікаў Установы;

- узгадненне ўнясення змен і дапаўненняў у структуру і штатны расклад Установы;

- зацвярджэнне Статута Установы, змен і (ці) дапаўненняў да яго.

7.4. Маёмасць Установы складае асноўныя фонды і адваротныя сродкі, а таксама іншыя матэрыяльныя каштоўнасці, кошт якіх адлюстроўваецца ў самастойным балансе.

7.5. Установа не мае права без згоды Заснавальніка адчужаць ці іншым спосабам распараджацца замацаванай за ёй маёмасцю і маёмасцю, набытай за кошт сродкаў, вылучаных ёй па каштарысе.

7.6. Установа фінансуецца за кошт сродкаў мясцовага бюджэту.

Дадатковымі крыніцамі фінансавання Установы з'яўляюцца:

- прыбыткі ад аказання платных паслуг у сферы адукацыі;
- дабравольная дапамога юрыдычных і фізічных асоб;
- іншыя крыніцы, не забароненыя заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

7.7. Установа можа ажыццяўляць дзейнасць, якая прыносіць прыбыткі, у адпаведнасці з заканадаўствам.

7.8. Грашовыя сродкі, атрыманыя ад дзейнасці, якая прыносіць прыбыткі, у тым ліку аказанні платных паслуг, паступаюць у самастойнае распараджэнне Установы, улічваюцца і расходуюцца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

7.9. Умацаванне, абнаўленне і развіццё матэрыяльна-тэхнічнай базы Установы ажыццяўляецца за кошт бюджэтных сродкаў, а таксама сродкаў, атрыманых у выніку аказання платных паслуг, дабравольнай дапамогі юрыдычных асоб, іншых відаў дзейнасці, якія не супярэчаць заканадаўству Рэспублікі Беларусь.

## РАЗДЗЕЛ 8
## ПАРАДАК КАНТРОЛЮ ДЗЕЙНАСЦІ УСТАНОВЫ

8.1. Дзяржаўны кантроль забеспячэння якасці адукацыі, яго парадак і перыядычнасць ажыццяўляецца ўпаўнаважанымі дзяржаўнымі органамі, устаноўленымі Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь.

8.2. Установа ажыццяўляе самакантроль за забеспячэннем якасці адукацыі праз комплексны аналіз адукацыйнай дзейнасці, які ўключае самаправерку дзейнасці і яе самаацэнку.

8.3. Парадак і перыядычнасць правядзення самакантролю за забеспячэннем якасці адукацыі вызначаецца дырэктарам Установы.

8.4. Установа прадастаўляе ва ўстаноўленым парадку статыстычную справаздачнасць, а таксама аператыўную інфармацыю аб выніках гаспадарчай дзейнасці Упаўнаважанаму органу.

Вядзенне бухгалтарскага ўліку ажыццяўляцца на дагаворных пачатках з арганізацыяй, якая аказвае паслугі па вядзенню бухгалтарскага ўліку і справаздачнасці.

8.5. Пісьмовая справаздачнасць органам кіравання адукацыі прадастаўляецца ў адпаведнасці з патрабаваннямі органаў дзяржаўнай статыстыкі Рэспублікі Беларусь.

8.6. За непрадастаўленне і скажэнне дзяржаўнай справаздачнасці, парушэнне тэрмінаў яе прадастаўлення службовай асобай Установа нясе ўстаноўленую заканадаўствам адказнасць.

8.7. Установа праходзіць дзяржаўную акрэдытацыю ў парадку, прадугледжаным Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

## РАЗДЗЕЛ 9
## МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

9.1. Установа мае права ажыццяўляць міжнароднае супрацоўніцтва ў сферы адукацыі, накіраванае на атрыманне адукацыі замежнымі грамадзянамі і асобамі без грамадзянства, якія часова знаходзяцца ці часова пражываюць у Рэспубліцы Беларусь, на абмен навучэнцаў і педагагічных работнікаў, а таксама на ўдзел у міжнародных адукацыйных мерапрыемствах.

9.2. Міжнароднае супрацоўніцтва ажыццяўляецца на аснове міжнародных дагавораў і дагавораў, заключаных паміж Установай і арганізацыяй замежнай дзяржавы, міжнародных і нацыянальных праектаў і праграм у сферы адукацыі.

9.3. Міжнароднае супрацоўніцтва Установа ажыццяўляе ў адпаведнасці з актамі заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

## ГЛАВА 10
## ПАРАДАК РЭАРГАНІЗАЦЫІ І ЛІКВІДАЦЫІ УСТАНОВЫ

10.1. Рашэнне аб рэарганізацыі і ліквідацыі Установы прымаецца Заснавальнікам на падставе ацэнкі наступстваў такой ліквідацыі ў парадку, прадугледжаным Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі.

## РАЗДЗЕЛ 11
## ЗАКЛЮЧНАЯ ЧАСТКА

11.1. Сапраўдны Статут уступае ў сілу з моманту яго дзяржаўнай рэгістрацыі ў парадку, усталяваным дзеючым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь. Змены і дапаўненні ў сапраўдны Статут зацвярджаюцца загадам Заснавальніка і належаць дзяржаўнай рэгістрацыі ў адпаведнасці з дзеючым заканадаўствам.

11.2. Сапраўдны Статут з’яўляецца новай рэдакцыяй Статута Установы, зарэгістраванай ў Адзіным дзяржаўным рэгістры юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў за №590860166 ад 28 верасня 2011 года.

У гэтым Статуце пранумаравана і прашыта __________лістоў

Начальнік аддзела адукацыі, спорту і турызму
Мастоўскага райвыканкама В.С. Ціхановіч